**Л.М.Рагачова,** *дацэнт*

# САЦЫЯЛЬНА-ГУМАНІТАРНЫЯ ВЕДЫ ЯК УМОВА РАЗВІЦЦЯ ТВОРЧАЙ ІНДЫВІДУАЛЬНАСЦІ СТУДЭНТА

Трансфармацыя сацыяльна-эканамічнай структуры сучаснага грамадства, рэфармаванне важнейшых аспектаў яго жыццядзейнасці патрабуюць адэкватных пераўтварэнняў усёй сацыякультурнай сферы, значным кампанентам якой з'яўляецца сістэма адукацыі. Сучасныя падыходы да разумення ролі і значэння адукацыйных структур грунтуюцца на прызнанні іх у якасці вядучага механізма ў нарошчванні інтэлектуальнага патэнцыялу краіны. Адукацыя – гэта тое звяно, якое не толькі мадэлюе, але і стварае рэальныя перадумовы для аднаўлення грамадскага развіцця. Накіраванасць адукацыі на будучыню вызначае яе прыярытэтнае значэнне ў дзяржаўнай палітыцы тых краін, якія клапоцяцца аб будучыні свайго народа.

Прызнаючы той факт, што творчыя здольнасці ўласцівы для ўсіх людзей, сучасная парадыгма адукацыі прадугледжвае больш высокі параметр іх развіцця, маючы на ўвазе творчую індывідуальнасць, што адпавядае гуманізацыі і гуманітарызацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу.

Для сацыякультурнай сферы гэты аспект выхавання будучага спецыяліста з'яўляецца базавым і сістэмаўтваральным. Высокая значнасць асобаснага станаўлення арганізатара сферы вольнага часу вызначаецца спецыфікай яго прафесійнай дзейнасці, якая складваецца ў працэсе камунікацыі з іншай асобай (чалавек – чалавек). Акрамя таго, прафесія работніка сацыякультурнай сферы адносіцца да такога віду дзейнасці, якая першапачаткова не можа быць стэрэатыпізавана. Задачы, звязаныя з пераходам ад асветніцка-прапагандысцкай практыкі культурнага развіцця да захавання унікальнасці кожнага ўдзельніка культурнага жыцця краіны, не могуць быць вырашаны без асобасна арыентаванага падыходу ў кожнай канкрэтнай сітуацыі, калі гатовыя рэцэпты,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шаблонныя пазіцыі заканамерна не ўспрымаюцца самой атмасферай суб'ект-суб'ектных узаемадзеянняў. Таму вельмі важна ў працэсе падрыхтоўкі будучых спецыялістаў забяспечыць дыялектычнае адзінства іх тэхналагічнага, сацыяльна-псіхалагічнага і асобаснага развіцця. Гэтыя адзінства і ўзаемадзеянне выступаюць умовай гарманічнага развіцця як самога спецыяліста, так і той мадэлі прафесійнай дзейнасці, якой ён будзе аддаваць перавагу.

Рэалізацыя такога канструктыўнага падыходу да фарміравання спецыяліста, калі ў аснову накіраванасці яго асобы пакладзена спалучэнне шматмернасці і унікальнасці кожнага чалавека, патрабуе мэтанакіраванага навуковага і арганізацыйна-метадычнага забеспячэння ўсяго працэсу станаўлення будучага работніка культурна-адпачынкавай сферы. Адным з важнейшых кірункаў у гэтым плане становяцца цесная ўзаемасувязь і ўзаемадзеянне дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага цыкла, у прыватнасці псіхолага-педагагічных і сацыякультурных навуковых ведаў.

Калі спецыяльныя прадметы, што далучаюць студэнтаў да прафесійнай дзейнасці, носяць тэхналагічны характар, то дысцыпліны сацыяльна-гуманітарнага зместу з'яўляюцца метадалагічнай асновай практычнай дзейнасці. Псіхолага-педагагічныя дысцыпліны значна ўздзейнічаюць на фарміраванне прафесійнага майстэрства і духоўнай культуры будучага спецыяліста. Засваенне псіхолага-педагагічных ведаў дазваляе студэнтам на прафесійным узроўні фарміраваць уменні разумець, успрымаць, суперажываць, адчуваць свайго суразмоўцу, каштоўнасць яго асобы, унікальнасць. У той жа час псіхолага-педагагічная кампетэнтнасць як аснова творчай індывідуальнасці спецыяліста залежыць не толькі ад засваення зыходных, базавых навуковых ісцін, нарматыўных эталонаў, але і ад умення ўбачыць вывучаемую з'яву ў як мага больш шырокім спектры ўзаемадзеянняў з рэчаіснасцю. Чалавек як аб'ект і суб'ект прафесійнай дзейнасці работнікаў сферы культуры і мастацтва – гэта не толькі біялагічная, але і сацыяльна-культурная істота, якая ў залежнасці ад гістарычных, сацыяльных, эканамічных, нацыянальных умоў бу-

дуе сваю сацыякультурную дзейнасць, адаптуючы яе як да сваёй духоўнай індывідуальнасці, так і да навакольнага асяроддзя. Уменне цэласна ўспрымаць чалавека ў яго сувязі з рэальным светам дазваляе пазбегнуць таго духоўнага вакууму, які ўзнікае пры ўспрыманні і арганізацыі выхаваўчага працэсу на падставе абстрактна створанай мадэлі. У выніку абстрагавання ад багатага ўнутранага свету асобы, яе шматграннага сацыяльнага вопыту ствараюцца ўмовы для дэфармацыі працэсу індывідуальнага, асобаснага развіцця, адбываецца маніпуляцыя яе паводзінамі.

У гэтым сэнсе вучэбны працэс у вышэйшых навучальных установах культуры і мастацтва павінен прадугледжваць магчымасці для інтэгратыўных падыходаў у выкладанні і пабудове псіхолага-педагагічных і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. Іх адзінства і ўзаемасувязь выступаюць базай для фарміравання новай парадыгмы прафесійнага мыслення студэнтаў, цэнтрам якога з'яўляецца чалавек з яго непаўторнай і унікальнай прыродай.

Механізм рэалізацыі такога падыходу да вучэбнага працэсу ў вышэйшай школе звязаны ў першую чаргу з фарміраваннем у студэнтаў ведаў і ўменняў на ўзроўні пераўтварэння і трансфармацыі, г.зн. пераносу ўспрынятых ведаў на вырашэнне задач у іншых абставінах і іншых сістэмах. Разглядаючы гэту задачу праз прызму засваення студэнтамі курса педагогікі, можна адзначыць шэраг умоў, якія не толькі паглыбяць узровень ведаў студэнтаў, але, што найбольш каштоўна, будуць садзейнічаць фарміраванню ў іх прафесійнай культуры.

Для цэласнага ўспрымання асобы ў працэсе яе развіцця студэнту неабходна мець усебаковае ўяўленне аб тых умовах, дзе адбываецца працэс сацыялізацыі чалавека: аб дамінуючых у грамадстве светапоглядных сістэмах, ступені развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы адукацыйнай сістэмы, узроўні зацікаўленасці дзяржавы і самой асобы ў выніках яе развіцця і інш. Такая шматузроўневая і шматбаковая карціна можа быць створана на падставе глыбокага сінтэзу такіх дысцыплін, як філасофія, рэлігіязнаўства, гісторыя, культуралогія, эканамічныя і прававыя

веды. Таму лагічна меркаваць, што блок агульнаадукацыйных дысцыплін больш прадукцыйна вывучаць не ў паслядоўным, а ў паралельным парадку. Для гэтага, на наш погляд, мэтазгодна рэфармаваць вучэбныя планы і вучэбныя праграмы па названых дысцыплінах. Галоўным кірункам іх рэструктурызацыі павінна стаць збліжэнне па часе вывучэння гістарычных эпох у рэчышчы кожнай канкрэтнай дысцыпліны. Апора студэнта на шматбаковае бачанне вывучаемай з'явы дазволіць разглядаць яе як ступень сусветна-гістарычнага цывілізацыйнага развіцця. Пры такой пабудове вучэбнага працэсу пашыраюцца магчымасці для інтэгратыўнага ўспрымання вучэбнага матэрыялу, што патрабуе не рэпрадуктыўнага, а творчага ўспрымання і асэнсавання праблемы. Акрамя таго, абсалютную значнасць з пункту гледжання фарміравання творчай індывідуальнасці асобы ўяўляе адаптацыя сістэмы сацыяльна-гуманітарных ведаў да ўнутранага свету кожнага студэнта. У працэсе сінтэзу атрыманых ведаў ажыццяўляецца як бы ўнутраны дыялог, заснаваны на разуменні інфармацыі і адаптацыі яе да духоўнага свету асобы студэнта. Гэты працэс заўсёды індывідуальны, насычаны творчым патэнцыялам. Парушэнне гармоніі паміж знешнімі ведамі і ўнутраным светам асобы непазбежна вядзе да эгаістычнасці, аднабаковасці меркаванняў. Успрымаемы ёю свет становіцца аднамерным, прымітыўным, а мысленне будучага спецыяліста акцэнтуецца на ведацэнтрысцкім падыходзе, калі факты, тэорыі, канцэпцыі, вызначаемыя ў розных вучэбных дысцыплінах, перагружаюць памяць студэнтаў, але не хвалююць іх душы.

Аналіз самастойных прац студэнтаў па гісторыі педагогікі, накіраваных на фарміраванне цэласнага падыходу да асэнсавання педагагічных з'яў праз прызму адзінства сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, сведчыць аб нетрадыцыйным падыходзе студэнтаў да выканання заданняў, адлюстроўвае пошукі самастойнага структуравання і паслядоўнасці размяшчэння фактаў, іх ацэнкі (прыкладам такіх работ з'яўляецца складанне структурна-лагічных схем, табліц, шкал каштоўнасных арыентацый у за-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лежнасці ад эпохі, складанне параўнальных характарыстык вывучаемых з'яў і інш.).

Разгледжаны варыянт актывізацыі вучэбнага працэсу ў мэтах развіцця творчай індывідуальнасці асобы студэнта не з'яўляецца першаадкрыццём у педагагічнай практыцы. Сістэма вальдорфскіх школ, якая ўзнікла ў 1919 г., дала свету прыклад гарманічнага выкладання вучэбных дысцыплін, дзе ўсе прадметы з першага класа па восьмы клас выкладае адзін настаўнік. Па прычыне пэўнай складанасці арганізацыі такога працэсу выхавання і навучання вальдорфская сістэма пакуль не атрымала значнага распаўсюджання ў свеце, але ідэя засваення сістэмных, цэласных ведаў прызнаецца ва ўсіх краінах. Таму мяркуем, што паступовае пашырэнне формаў, метадаў, прыёмаў, якія садзейнічаюць ужыванню інтэгратыўнага падыходу да выкладання сацыягуманітарных дысцыплін у вышэйшых навучальных установах, будзе пазітыўна ўплываць на павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў для сферы сацыякультурнай дзейнасці.

**У.Д.Розенфельд**, *профессор*

## О МОДЕЛИ ГУМАНИТАРИЗАЦИИ ОБРАЗОВАНИЯ В БЕЛАРУСИ

Реформирование высшей школы в качестве одного из магистральных путей предусматривает гуманитаризацию образования.

Закономерно, что практическую реализацию этого процесса чаще всего возлагают на кафедры социально-гуманитарных наук. Это в принципе правильно, но явно недостаточно для эффективной перестройки работы высшей школы. Пожалуй, исходной проблемой, в значительной степени предопределяющей гуманитаризацию образования, является теоретическое осмысление по-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ